4) использованием на уроках аудиовизуальных средств;
5) использованием личностной индивидуализации;
6) разработкой системы внеклассных занятий, усиливающих мотивационную сторону изучения языка [1, с. 93].

Так же благодаря наблюдениям, можно сказать, что повышение мотивации идет через:
1) вовлечение студентов в самостоятельную работу на занятии;
2) проблемность заданий и ситуаций;
3) контроль знаний умений и навыков;
4) использование познавательных игр;
5) страноведческий материал и, конечно, доброжелательное отношение учащихся [2, с. 45].

Согласно психологическим исследованиям мотивации и интереса при обучении иностранному языку усилия преподавателя должны быть направлены на развитие внутренней мотивации учения студентов, которая исходит из самой деятельности и обладает наибольшей побудительной силой. Внутренняя мотивация определяет отношение студентов к предмету и обеспечивает продвижение в овладении иностранным языком. Если студентов побуждает заниматься сама деятельность, когда им нравится говорить, читать, воспринимать иностранную речь на слух, узнавать новое, тогда можно сказать, что у них есть интерес к предмету «иностранный язык» и обеспечены условия для достижения определенных успехов.

**Заключение.** Стремление к коммуникативной компетенции, как к конечному результату обучения, предполагает не только владение соответствующей иноязычной техникой (т.е. языковую компетенцию студентов), но и усвоение колоссальной неязыковой информации, необходимой для адекватного обучения и взаимопонимания, потому что последнее недостижимо без относительного равенства основных сведений общающихся об окружаемой действительности. Заметное различие в запасе этих сведений у носителей разных языков в основном определяется различными материальными и духовными условиями существования соответствующих народов и стран, особенностями их истории, культуры, общественно-политического строя, политической системы и т.п. Таким образом, общепризнанным стал вывод о необходимости глубоко знать специфику страны (стран) изучаемого языка и тем самым о необходимости страноведческого подхода как одного из главных принципов обучения иностранным языкам.

Список литературы

1. Плотицына, Н.В. Лингвострановедение : язык в соприкосновении культур : учеб. пособие / Н.В. Плотицина. – М. : Просвещение, 2012. – 190 с.
2. Фатихов, Д.Ф. Лингвострановедение, страноведение и иноязычная культура : учеб. пособие / Д.Ф. Фатихов. – Академия, 2014. – 180 с.

## ПРА ДЫСТАНЦЫЙНАЕ ВЫКЛАДАННЕ АСОБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ

*В.Э. Зіманскі*
*Віцебск, ВДУ імя П.М. Машэрава*

Дыстанцыйнае навучанне, ідэя якога становіцца ўсё больш папулярнай у Беларусі, не новая форма адукацыйнай практыкі: узнікшы ўпершыню яшчэ ў XVIII ст. [1], у маштабах планеты яна пачала заваёўваць адукацыйную прастору яшчэ ў мінулым стагоддзі. На сённяшні дзень тэхналогіі дыстанцыйнага навучання выкарыстоўваюцца ў розных частках свету ў такіх суадносінах:




(1 – Бліжні Усход, 2 – Цэнтральная Амерыка, 3 – Лацінская Амерыка, 4 – Аўстралія, 5 – Азія, 6 – Расія, 7 – Афрыка, 8 – Паўночная Амерыка, 9 – Еўропа).

Репозиторий ВГУ

Нашы ўсходнія суседзі даволі актыўна выкарыстоўваюць дыстанцыйныя форма навучання як у адукацыйным, так і ў карпаратыўным сектары. Сярод найбольш значных праектаў назавём: e-college.ru – праект Маскоўскага інстытута эканомікі, менеджменту і права; Адзіная сістэма дыстанцыйнага навучання (АСДН) – віртуальнае адукацыйнае асяроддзе для ўсіх каледжаў г. Масква; Symedu – сервісы дыстанцыйнага навучання для розных катэгорый навучэнцаў (модулі дыстанцыйнага навучання па Рызыка-менеджменце, Мікраэканоміцы, Матэматычным аналізе, Элементарнай матэматыцы); www.ido.edu.ru - Інстытут дыстанцыйнага навучання Расійскага ўніверсітэта дружбы народаў; www.ido.tsu.ru – Інстытут дыстанцыйнага навучання Томскага дзяржаўнага ўніверсітэта; www.openet.ru – Расійскі дзяржаўны інстытут адкрытага навучання і інш (усяго там зараз актыўна дзейнічаюць да 70 цэнтраў дыстанцыйнага навучання).

З развіццём камп'ютарных тэхналогій пашырэнню гэтай формы адукацыі спрыяе павелічэнне колькасці разнастайных сістэм дыстанцыйнага навучання. У суседняй Расіі, напрыклад, існуе вялікая колькасць праграмных прадуктаў для забеспячэння якаснага навучальнага працэсу на адлегласці [2]. Сярод найбольш ужывальных наступныя:




Такім чынам, дыстанцыйнае навучанне ўсё больш упэўнена ўкараняецца ў сучасны навучальны працэс, таму асаблівасці яго выкарыстання ў не толькі пры выкладанні дакладных, прыродазнаўчых, але і гуманітарных дысцыплін з'яўляецца надзвычай актуальным.

Галоўная мэта артыкула – паказаць, як дыстанцыйныя метады працы могуць быць прыменены пры выкладанні любой дысцыпліны. Асноўнымі задачамі з'яўляюцца наступныя: 1) распрацаваць этапы падрыхтоўкі выкладчыка да дыстанцыйнага выкладання курса; 2) вызначыць абавязковыя структурныя элементы арганізацыі працы з праграмным матэрыялам; 3) акрэсліць формы кантактавання навучэнца з выкладчыкам.

**Матэрыял і метады**. Матэрыялам даследавання паслужылі аўтарскія распрацоўкі дыстанцыйнага курса "Беларуская мова (прафесійная лексіка)", прачытанага студэнтам гістарычнага факультэта і факультэта сацыяльнай педагогікі і псіхалогіі 2014 і 2015 гг. набору (10 чалавек); былі выкарыстаны параўнальны метад, метад кампанентнага аналізу, метад структурнага аналізу, сінтэтычны метад.

**Вынікі і іх абмеркаванне.** Любы навучальны курс неабходна падрыхтаваць да абранай формы выкладання, выпрацаваць стратэгію працы і алгарытм падачы. У нашым выпадку бачыцца неабходным пачаць з падрыхтоўкі:

1. Метадычнага забеспячэння (рэйтынг-план, інфармацыя пра бонусныя і штрафныя балы за якасць і своечасовасць выканання працы, тэматычны модульны план, літаратура, слоўнік (гласарый), спіс літаратуры). Асобна рэкамендуецца падрыхтаваць памятку па вывучэнні дысцыпліны, у якой выкласці патрабаванні па выкарыстанні прапанаванага дыдактычнага матэрыялу, тэрміны выканання заданняў, форму кантакту з выкладчыкам, магчымасць атрымання кансультацый, парадак адсылкі заданняў на праверку і парадак дапрацоўкі незалічаных заданняў.

2. Матэрыялаў для тэарэтычнай падрыхтоўкі (электронныя – абавязкова, папяровыя – пры неабходнасці). Гэта могуць быць курсы лекцый (у тым ліку інтэрактыўныя), тэарэтычныя дапаможнікі, спасылкі на інтэрнэт-рэсурсы і г.д.

3. Матэрыялаў для практычнай працы: электронныя заданні (у тым ліку і ў межах рэсурса Moodle), практыкаванні, тэмы рэфератаў, дакладаў.

Рэпазіторый ВДУ

4. Матэрыялаў для прамежкавага і выніковага кантролю (тэсты, кантрольныя працы, заданні).

Пасля гэтага важна вызначыць: 1. Які рэзерв часу маецца (на які тэрмін разлічаны курс); на колькі модуляў падзелены курс; як размеркаваць модулі курса па тэрмінах выканання. 2. Які аб'ём матэрыялу выдзеліць для online, offline заняткаў і які – для самастойнага вывучэння. 3. Якія спосабы праверкі ведаў, уменняў і навыкаў прадугледзець пасля вывучэння кожнага модуля (або пасля кожных заняткаў). 4. Што і ў якой форме будзе правярацца на выніковым кантролі. 5. У якой форме будзе праведзены залік (экзамен); патрабаванні да заліку (экзамену).

Гэту інфармацыю часткова неабходна адлюстраваць у рэйтынг-плане і ў памятцы.

Online-заняткі пры дыстанцыйнай форме навучання мяркуецца праводзіць у выглядзе відэаканферэнцый ці вэбінараў; пры адсутнасці тэхнічнай магчымасці можна прымяніць перапіску праз электронную пошту, у тым ліку і ў межах абранай адукацыйнай сістэмы. (Падрабязней гл.: [3, с. 22–38]).

**Заключэнне.** Такім чынам, дыстанцыйная форма навучання ў сучасных умовах здольна забяспечваць якаснае засваенне не толькі дакладных, але і гуманітарных дысцыплін – пры ўмове скрупулёзнага падыходу да ўсебаковай падрыхтоўкі самога працэсу навучання як з боку выкладчыка, так і з боку навучэнца (для якога не апошнюю ролю адыгрывае тэхнічная магчымасць удзелу ў адукацыйным працэсе). Асобна адзначым, што дыстанцыйная форма працы можа прымяняцца як у ходзе вывучэння асобнай дысцыпліны ў цэлым, так і ў якасці элемента курса (як кампанент вучэбнай дзейнасці) – пры такіх відах вучэбнай работы, як дадатковая (паглыбленая) падрыхтоўка па асноўных тэмах курса; кіруемая самастойная работа; самакантроль; падрыхтоўка да экзаменаў і залікаў; адпрацоўка прапушчаных заняткаў.

Спіс літаратуры

1. Батаев, А.В. Анализ российского рынка дистанционного образования / А.В. Батаев. // Молодой ученый, 2015. – №21. – С. 350-353.
2. Батаев, А. В. Обзор рынка систем дистанционного обучения в России и мире / А.В. Батаев. // Молодой ученый, 2015.– №17. – С. 433-436.
3. Зиманский, В.Э. Теория и практика организации и проведения дистанционного обучения: методические рекомендации / сост.: В.Э.Зиманский, В.А.Жизневский, М.И.Трофимова. – Витебск : ВГУ им. П.М. Машерова, 2016. – 47 с.

## РОЛЬ ЗНАКОВЫХ СИСТЕМ В МЕЖДУНАРОДНОЙ КОММУНИКАЦИИ

*В.М. Коврыга, А.Н. Костючков*
*Витебск, ВГУ имени П.М. Машерова*

Актуальность работы заключается в том, что в настоящее время возрастает роль коммуникации в жизни современного общества, которая является инструментом консолидации общества на основе определенных идей и принципов. Именно в процессе общения происходит формирование личности (в общении с природой, в процессе познания ее законов, общении с другими людьми). На основе общения, коммуникативных связей и отношений с другими людьми сформировался язык, т. е. система знаков (слов устной речи и предложений письменной речи, жестов, телодвижений и др.).

Цель работы – изучить роль языков международного общения в процессе межкультурной коммуникации.

**Материал и методы.** Материалом исследования служат знаковые системы (мировые, международные, формализованные языки), используемые в процессах международной коммуникации. В ходе работы используются эмпирический и сравнительный методы.

**Результаты и их обсуждение.** Одной из сторон коммуникации выступают процессы перекодировки вербальной в невербальную и невербальной в вербальную сферы [1, с. 14]. Большинство процессов, объединяющих людей между собой, функционируют и развиваются благодаря коммуникации. Эффективность коммуникации между людьми зависит от уровня взаимопонимания между ними. Роль языка в современном мире, а также его распространенность за пределами этнической территории дают основания выделять языки межнационального общения и мировые языки. Грамотное использование языков чрезвычайно важно для работы, поскольку оно обеспечивает точные и понятные коммуникацию и понимание в вопросах глобального значения.

Репозиторий ВГУ